# Водзыў

навуковага кансультанта на дысертацыю
Даніловіча Вячаслава Віктаравіча
«Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)»,
прадстаўленую на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Перад сучаснай гістарычнай навукай паўстала непростая задача паглыбленага даследавання жыццёвага вопыту беларускага народа і аб'ектыўнага асвятлення праблем грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных пераўтварэнняў, паказу стваральнай працы тых, хто, пераадольваючы многія няўзгоды, іншы раз інтуітыўна, не маючы жыццёвага вопыту і неабходных ведаў, самаахвярна ўдзельнічалі ў пабудове новага грамадства. Менавіта беларуская моладзь, у складанейшы перыяд 20–30-х гадоў ХХ стагоддзя, калі ўпершыню ў гісторыі была разгорнута маштабная па размаху і ідэйна-палітычнай глыбіні праца, накіраваная на пабудову беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, прымала самы актыўны ўдзел у няпростых і супярэчлівых працэсах дзяржаўнага будаўніцтва.

Прайшло ўжо больш за 100 гадоў з таго часу, калі разгортваліся небывалыя ў гісторыі сацыяльна-палітычныя працэсы, калі барацьба за пабудову новага сацыялістычнага грамадства станавілася сэнсам жыцця многіх людзей. Сёння айчынныя даследчыкі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, пераадольваючы многія склаўшыеся традыцыі, імкнуцца пазбягаць не толькі ангажыраваных і палітызаваных ацэнак развіцця беларускага грамадства, але непрадузята з навуковых нацыянальна-дзяржаўных пазіцый вывучыць і асвятляць ролю маладога пакалення ў жыцці беларускага грамадства.

Як бачыцца, менавіта дысертацыйнае даследаванне В. В. Даніловіча прысвечана гэтай важнай і недастаткова распрацаванай у айчыннай гістарыяграфіі праблеме. Саіскальнік здолеў раскрыць і на шматлікіх пераканаўчых прыкладах паказаць ролю і месца маладога пакалення ў станаўленні і развіцці беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, якая праходзіла ў складанейшы перыяд грамадска-палітычнага жыцця беларускага народа.

Можна канстатаваць, што дысертацыя В. В. Даніловіча «Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)» з'яўляецца першым у гістарычнай навуцы комплексным даследаваннем, у якім на багатым фактапагічным матэрыяле крытычна асэнсавана вялікае кола літаратурных крыніц і архіўных дакументаў, глыбока паказана сутнасць, вызначаны канцэптуальны змест, тэндэнцыі, заканамернасці і выяўлены асаблівасці і маштаб удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гадах.

Багаты факталагічны матэрыял дазволіў саіскальніку выявіць перыяды станаўлення і развіцця беларускага камсамола; адлюстраваць асаблівасці нацыянальнага маладзёжнага руху; вызначыць характэрныя рысы ўдзелу моладзі ў дзейнасці дзяржаўных органаў і Саветаў; раскрыць формы і выявіць перыяды ідэйна-палітычнай асветы маладога пакалення, а таксама перыяды і асаблівасці ўдзелу юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным жыцці.

Навуковыя здабыткі саіскальніка будуюцца на падставе шырокага выкарыстання матэрыялаў існуючай гістарыяграфіі, а таксама вялікага кола разнастайных архіўных крыніц. У прыватнасці, дысертант выкарыстоўваў многія дакументальныя матэрыялы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці, Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі і Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі. Нельга не адзначыць, што ў дысертацыйным даследаванні выкарыстаны матэрыялы тагачаснага дзяржаўнага і грамадскага перыядычнага друку, у першую чаргу тых, што былі апублікаваны ў маладзёжных газетах і часопісах.

Дысертацыя В. В. Даніловіча з’яўляецца навукова-кваліфікацыйнай працай, у якой на высокім навукова-тэарэтычным узроўні распрацаваны многія тэарэтычныя палажэнні, сукупнасць якіх можна кваліфікаваць як новае буйное дасягненне ў развіцці айчыннай гістарыяграфіі. Саіскальнік на высокім тэарэтычным узроўні здолеў абагуліць атрыманыя даныя і прывесці іх у агульную канцэпцыю даследавання, што дазволіла вырашыць пастаўленыя задачы ў лагічнай паслядоўнасці.

Безумоўна, укараненне аўтарскіх ідэй у новыя навуковыя гістарычныя даследаванні, якія асвятляюць працэсы, што праходзілі ў 20–30-х гадах у грамадска-палітычным і сацыяльна-культурным жыцці Савецкай Беларусі, уносіць не толькі значны навуковы ўклад, але і садзейнічае аб’ектыўнаму асвятленню мінулага беларускага народа.

Неабходна адзначыць, што дысертацыйнае даследаванне В. В. Даніловіча мае не толькі важнае тэарэтычнае, але і практычнае значэнне. Факталагічны матэрыял належным чынам апрацаваны. Палажэнні, якія выносяцца аўтарам на абарону, утрымліваюць новыя факты і падзеі гістарычнага мінулага, якія будуць садзейнічаць больш глыбокаму разуменню гісторыі Беларусі, што сведчыць аб валоданні саіскальнікам навуковай метадалогіяй. Важна адзначыць і той факт, што атрыманыя вынікі прайшлі грунтоўную апрабацыю на 23 навуковых форумах і прадстаўлены ў 55 навуковых публікацыях, з якіх 25 – у выданнях, рэкамендаваных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь.

Важным дасягненнем саіскальніка з’яўляецца тое, што вынікі даследавання не толькі маюць грунтоўную навуковую апрабацыю, але і

шырока выкарыстоўваюцца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе школ і ВНУ краіны. Многія аўтарскія высновы і факталагічныя матэрыялы, якія выяўлены і абагульнены у дысертацыйным даследаванні, выкладзены ў шэрагу фундаментальных акадэмічных прац, такіх як "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" у 5 тамах, "Республика Беларусь. 25 лет созидания и свершения" у 7 тамах, "Рижский мир в судьбе белорусского народа : 1921–1953 гг." у 2 тамах і інш. Матэрыялы даследаванняў шырока выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтаў і навучэнцаў, пры распрацоўцы і ўдасканаленні курсаў, спецкурсаў і факультатываў па гісторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці, маладзёжнага руху. Практычная запатрабаванасць пацвярджаецца шасцю актамі аб укараненні вынікаў дысертацыйнага даследавання ў адукацыйны працэс устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі і Расіі.

Больш таго, вынікі дысертацыйнага даследавання В. В. Даніловіча маюць патэнцыял практычнага выкарыстання ў заканадаўчай справе, для перспектыўнай распрацоўкі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці, могуць быць запатрабаваны органамі ўлады і кіравання ў працэсе далейшага ўдасканалення і развіцця маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Дысертацыя адпавядае патрабаванням Палажэння аб парадку прысуджэння вучоных ступеней, зацверджанага пастановай ВАК Рэспублікі Беларусь 22 жніўня 2022 г. № 5.

Несумненна, В. В. Даніловіч – глыбокі, прафесійны даследчык, яго навуковы ўклад у распрацоўку акрэсленай праблемы мае важнае значэнне для развіцця гістарычнай навукі Беларусі, а навуковая кваліфікацыя адпавядае вучонай ступені доктара гістарычных навук, на якую ён прэтэндуе.

Безумоўна, Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Навуковы кансультант
доктар гістарычных навук, прафесар,
акадэмік Нацыянальнай акадэміі
навук Беларусі, акадэмік-сакратар
Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А. А. Каваленя